# НА ШЛЯХУ ДА АГУЛЬНЫХ МІЖНАРОДНЫХ СТАНДАРТАЎ ПРАКТЫКІ РАЗВІЦЦЯ СУПОЛЬНАСЦЯЎ











iACD
International Association for Community Development
Association Internationale de Développement et D'Action Communautaires

2018 65TH ANNIVERSARY YEAR

WITHOUT COMMUNITY DEVELOPMENT
THERE IS NO SUSTAINABLE DEVELOPMENT



## ПРАДМОВА

Гэты дапаможнік асвятляе асновы агульных міжнародных стандартаў практыкі развіцця супольнасцяў. Ён раскрывае галоўныя тэмы і галіны практыкі развіцця супольнасцяў, агульныя для ўсіх частак свету, і вызначае мэту практыкі развіцця прафесійных супольнасцяў, каштоўнасці, якія стаяць у падмурку, і галоўныя метады, якія выкарыстоўваюць спецыялісты.













У кастрычніку 2016 года Міжнародная Асацыяцыя Развіцця Супольнасцяў (International Association for Community Development – IACD) паведаміла ўсім членам асацыяцыі, што пасля прыняцця новага азначэння развіцця супольнасцяў на штогадовым агульным сходзе, камітэты Навучання і Прафесійнага развіцця пачалі працу над дапаможнікам для тых, хто займаецца практыкай развіцця супольнасцяў. Кіраўніцтва IACD згадзілася працаваць з Саветам па Стандартах Навучання і Развіцця Супольнасцяў Шатландыі (Community Learning and Development Standards Council Scotland - CLDSC) для прасоўвання гэтага праекта. У 2014 годзе CLDSC і IACD былі партнёрамі ў арганізацыі канферэнцыі па развіцця міжнароднай супольнасці ў Глазга. CLDSC – гэта агенцтва спецыялістаў у Шатландыі, якое працуе ў гэтай галіне і мае больш чым трыццацігадовы вопыт у распрацоўцы стандартаў развіцця супольнасцяў. Была створана аб'яднаная працоўная група для распрацоўкі праекта дапаможніка, і ў кастрычніку 2016 года мы разаслалі ўдзельнікам пачатковы варыянт для абмеркавання, у якім асаблівая ўвага надзялялася прыкладам працы па стварэнні стандартаў развіцця міжнародных супольнасцяў, якая ўжо праводзілася ў некаторых краінах.

Працоўная група збіралася некалькі разоў, каб падрыхтаваць праект Дапаможніка па Агульных Міжнародных Стандартах Развіцця Супольнасцяў. Гэты праект быў разасланы ўсім членам IACD для абмеркавання, якое доўжылася чатыры месяцы і скончылася 31 сакавіка 2018 года. Гэта перадгісторыя праекта, карыснага, па меркаванні IACD, розным зацікаўленых бакам, якія бяруць удзел у развіцці супольнасцяў: самім супольнасцям, спецыялістам, трэнерам, працадаўцам, фундатарам, кансультантам і іншым – каб сфармаваць агульнае для ўсіх краін разуменне, што такое практыка развіцця супольнасцяў. Ці, інакш кажучы, што пад ёй разумеецца. Мы разглядаем гэтыя Міжнародныя Стандарты як аснову, якая можа быць прыстасавана да розных умоў працы як нашых удзельнікаў, так і іншых людзей з розных краін.

1. IACD – Навучанне і Развіццё Супольнасцяў
2. CLDSC – гэта орган у Шатланды, адказны за ўстанаўленне стандартаў і ўхваленне прафесійнай падрыхтоўкі. Гэтыя функцыі першапачаткова выконваў Шатландскі Савет па Адукацыі Супольнасцяў, але пазней яго паўнамоцтвы перайшлі да CLDSC.





Мы атрымалі водгукі на праект дапаможніка ад удзельнікаў са ўсяго свету – ад Кітая і Паўднёвай Афрыкі да Канады, Аўстраліі і Партугаліі, ад ЗША і Новай Зеландыі да Вялікабрытаніі і Кеніі. Гэта была, сапраўды, сусветная праца, і мы бязмерна ўдзячныя ўсім і за падтрымку, і за крытыку. Некаторыя адказы былі ад прыватных асоб, але большасць прыйшла ад нацыянальных і рэгіянальных аб’яднанняў. Было відавочна, што на іх падрыхтоўку сышло шмат часу. Асноўная частка водгукаў датычылася спецыфічных фармулёвак канкрэтных сказаў і абзацаў Дапаможніка, прапановаў змяніць, прыбраць ці дадаць нешта, але, у асноўным, мы атрымалі вялікую падтрымку. Большасць адказаў моцна ўхвалялі ініцыятыву IACD. Аднак таксама мы атрымалі некалькі адказаў ад членаў Асацыяцыі, заклапочаных тым, што, паводле дапаможніка і ранейшага азначэння развіцця супольнасцяў, IACD у выніку не ўключала ў гэты панятак неаплачвальных спецыялістаў і грамадскіх актывістаў. У такім выпадку можна трапіць у пастку, у якую траплялі многія іншыя, – стварыць закрытыя прафесіі. Гэта важныя заўвагі, і мы спрабуем вырашыць гэтыя праблемы, падкрэсліваючы наша моцнае жаданне быць адкрытай арганізацыяй. Мы ніколі не мелі намеру быць закрытымі.



IACD заўсёды шырока глядзела на тое, хто можа лічыцца спецыялістам па развіцці супольнасцяў, хоць зразумела, што гэта пасада, адрозная ад грамадзянскага лідара, актывіста ці зацікаўленага грамадзяніна. Спецыялісты па развіцці супольнасцяў могуць быць – і часта ёсць – неаплачвальнымі, і хоць IACD не прафсаюз, нашым вялікім вопытам мы падкрэсліваем, што праца па развіцці супольнасцяў цяжкая і напружаная. Таму мы вельмі хочам, каб спецыялістам гэтай сферы плацілі і наймалі іх на працу на добрых умовах.





Таксама мы хочам бачыць, што ўсе спецыялісты па развіцці супольнасцяў маюць магчымасць прайсці высокаякасную падрыхтоўку да прафесіі і курсы павышэння кваліфікацыі. Мы заклікаем адукацыйныя арганізацыі прымаць і выкарыстоўваць папярэдні эксперыментальны вопыт спецыялістаў і забяспечваць шырэйшы доступ для лідараў і актывістаў супольнасцяў карэнных жыхароў і працоўнага класу. Па нашых падліках, каля тысячы студэнцкіх курсаў па ўсім свеце навучаюць развіццю супольнасцяў (глядзіце сусветны агляд ніжэй). Прасоўванне высокіх стандартаў у падрыхтоўцы такіх курсаў забяспечвае практыку развіцця супольнасцяў, што ў інтарэсах як спецыялістаў па развіцці супольнасцяў, так і саміх супольнасцяў.



Паводле азначэння IACD, развіццё супольнасцяў – гэта як практычная прафесія, так і акадэмічная дысцыпліна. Каб выконваць гэтую складаную, патрабавальную, часам небяспечную і безумоўна “брудную” працу, спецыялістам неабходна веданне палітычных, сацыяльных і экалагічных дысцыплін, якія дадуць ім шырэйшае разуменне сувязі рэалій чалавечага жыцця, іх сацыяльнага, палітычнага, культурнага, эканамічнага і экалагічнага асяроддзя і таго, як дасягнуць зменаў, якія пашыраюць правы і магчымасці людзей. Спецыялістам трэба валодаць уменнем наладжваць камунікацыю, быць эфектыўнымі настаўнікамі і арганізатарамі, знаходзіць рэсурсы, праяўляць эмпатыю. А ў падмурку ўсяго вышэйпералічанага павінны стаяць універсальныя каштоўнасці сацыяльнай і экалагічнай справядлівасці і дэмакратыя ўдзелу.

Мы ўжо выказваліся наконт залішняй тэарэтычнасці ў навучанні развіццю супольнасцяў на курсах устаноў вышэйшай адукацыі ў некаторых краінах. Існуе патрэба ў разумным балансе паміж падрабязным вывучэннем асноў і практычнай падрыхтоўкай з атрыманнем вопыту працы. Каб сапраўды трансфармаваць, для практыкі развіцця супольнасцяў патрэбныя розум, рукі і сэрца, а таксама практыка, падмацаваная арганізаванай сістэмай ведаў, якая, у сваю чаргу, зноў дапаўняецца практыкай і даследаваннямі.



3. http://www.iacdglobal.org/2017/09/18/are-we-now-ready-for-an-inter-national-forum-for-professional-community-development-educators/







Публікуючы **“Агульныя міжнародныя стандарты практыкі развіцця супольнасцяў”**, мы разумеем неабходнасць растлумачыць, што мы разумеем пад тэрмінам “прафесія”. Адзін з адказаў на праект дапаможніка асвятляе гэта, таму мы цытуем яго тут… *“Хоць у дакуменце пра стандарты практыкі няма азначэння панятку “прафесіяналізм”, (спасылаючыся на працу з прафесійна роднаснымі дысцыплінамі, такімі як сацыяльная праца, медыцынскія дысцыпліны, гарадское планаванне і архітэктура і патрэбу ва ўстанаўленні стандартаў практыкі) можна мець на ўвазе, што тэрмін “прафесіянал” ужыты ў дакуменце ў значэнні людзей, якія валодаюць экспертнымі ведамі і навыкамі, працуюць у сферы развіцця супольнасцяў у межах устаноўленых стандартаў практыкі пад наглядам прафесійнай арганізацыі. Бясспрэчна, існуюць і іншыя азначэнні гэтага тэрміна. Напрыклад, гэта слова выкарыстоўваюць у адносінах да паважлівага, спагадлівага і кампетэнтнага чалавека і, у выпадку развіцця супольнасцяў, таго, які дзейнічае ў межах паўнамоцтваў, устаноўленых супольнасцю, а не знешнімі экспертамі. Але такі падыход да разумення прафесіяналізму не сфармуляваны ў дакуменце”.*

Гэта разумны пункт гледжання, і, адказваючы на яго, мы падкрэсліваем, што IACD ужывае гэты тэрмін у абодвух значэннях. Менавіта таму ў IACD мы раскрылі панятак развіцця супольнасцяў як “прафесію, якая пашырае правы і магчымасці людзей”, каб паказаць прыроду адносін паміж спецыялістам і людзьмі, з якімі мы працуем (якія таксама могуць быць нашымі працадаўцамі).

Мы прызнаем таксама інтарэсы тых, хто, у рэальнасці, мае голас у падтрымцы і ўдасканаленні нашай практыкі: нашых сяброў (аплачвальных і неаплачвальных), працадаўцаў і фундатараў, нацыянальных і рэгіянальных агенцтваў па падтрымцы прафесійных стандартаў (дзе яны існуюць) і супольнасцяў, з якімі мы працуем.



Мы ўпэўнены, што менавіта нацыянальныя органы, якія з'яўляюцца прадстаўнікамі ўсіх зацікаўленых бакоў, павінны несці адказнасць за адпаведнасць нацыянальным стандартам, кантроль і практычную дапамогу, а таксама за падтрымку навучальных курсаў і курсаў павышэння кваліфікацыі па развіцці супольнасцяў. Роля IACD заключаецца ў заахвочванні да ўзаемадзеяння і абмену ідэямі і падыходамі паміж нацыянальнымі органамі і творчымі міжнароднымі аб'яднаннямі практыкаў. Аднак, такія нацыянальныя органы і нацыянальныя стандарты ёсць толькі ў некалькіх краінах. Адна з іх – Шатландыя, дзе цяпер базуецца IACD.

Мы прадстаўляем гэты даклад Камітэта па Навучанні і Прафесійным Развіцці IACD сваім удзельнікам і шырокаму колу людзей па ўсім свеце як інструкцыю для спецыялістаў, супольнасцяў, адукацыйных і навучальных арганізацый, працадаўцаў, рэгіянальных і нацыянальных асацыяцый развіцця супольнасцяў і нацыянальных урадаў, з мэтай палепшыць якасць, празрыстасць і пададказнасць практыкі развіцця супольнасцяў і якасць базавага і сталага прафесійнага развіцця ў падтрымку гэтай практыкі.




**Поль Лашапэль**

Прэзідэнт Міжнароднай Асацыяцыі Развіцця Супольнасцяў

**Джон Стэнсфілд**

Старшыня Камітэта па Навучанні і Прафесійным Развіцці IACD









# ПЕРАДУМОВЫ

У 2016 годзе Савет IACD і Штогадовы агульны сход прынялі для асацыяцыі наступнае глабальнае азначэнне развіцця супольнасцяў:

***"Развіццё супольнасцяў – гэта практыка-арыентаваная прафесія і акадэмічная дысцыпліна, якая прасоўвае дэмакратыю, устойлівае развіццё, правы, эканамічные магчымасці, роўнасць і сацыяльную справядлівасць праз арганізацыю, адукацыю і пашырэнне правоў і магчымасцяў людзей у межах іх супольнасцяў, сфармаваных па месцазнаходжанні, ідэнтычнасці ці зацікаўленасці, у гарадскіх ці сельскіх раёнах".***

З таго часу некаторыя нацыянальныя асацыяцыі развіцця супольнасцяў таксама прынялі гэта азначэнне ці разглядаюць яго прыняцце. Гэта сведчыць, што паміж нашымі ўдзельнікамі расце ўзаемаразуменне наконт таго, што гэта азначэнне адлюстроўвае рэаліі практыкі, і таму дапамагае забяспечыць яе агульнае разуменне.

Азначэнне IACD будуецца на вельмі шырокім разуменні развіцця супольнасцяў, якое было прынята ААН у 1950-ыя гады, калі была заснавана IACD. Мы па-ранейшаму падтрымліваем зробленую тады заяву, што развіццё супольнасцяў – гэта "працэс сумесных дзеянняў удзельнікаў супольнасці і вырашэння агульных праблем". З 1950-ых гадоў, калі ААН упершыню ўжыла гэты тэрмін, ён таксама апісваў развіццё супольнасцяў як "працэс забеспячэння праграм тэхнічнай дапамогі і міжведамаснай каардынацыі… з дапамогай якіх развіваюцца слабаразвітыя тэрыторыі". З самага пачатку ААН, нацыянальныя ўрады і іншыя, уключна з IACD, разумелі развіццё супольнасцяў як узаемазвязаныя калектыўныя дзеянні супольнасцяў з забеспячэннем такіх супольнасцяў тэхнічнымі ці іншымі формамі дапамогі.



На пачатку 2018 года мы апублікавалі спецыяльны выпуск часопіса IACD “Practice Insights”, каб адзначыць наш 65-гадовы юбілей. У ім мы ўзгадалі шэраг людзей і падзей, якія паўплывалі на наш рух цягам шасці дзесяцігоддзяў. Шмат людзей прыклалі руку да фармавання нашага мыслення і дзейнасці. Як мы напісалі ў рэдакцыйным артыкуле, *“За апошнія шэсцьдзясят год дзясяткі тысячаў спецыялістаў па развіцці супольнасцяў прысвяцілі сваю кампетэнтнасць узмацненню супольнасцяў, калектыўнай дзейнасці, паляпшэнню жыцця людзей і клопату пра планету. Іх праца падтрымала найбольш безабаронных людзей па ўсім свеце, каб яны мелі не толькі голас, але і сродкі для дзеяння”.*



У юбілейным спецвыпуску мы заўважылі, што развіццё супольнасцяў заўсёды было палітычна спрэчнай практыкай. І кансерватары, і радыкалы прымалі гэты тэрмін, але часам з зусім рознымі вынікамі. Спецыялісты па развіцці супольнасцяў і тысячы навуковых прац і публікацый пра развіццё супольнасцяў сведчылі і сведчаць пра багацце крытычных водгукаў у нашай галіне, што заўсёды было знакам “здароўя” прафесіі. Менавіта спецыялісты сфармавалі наша стаўленне да асноўных каштоўнасцяў, разумеючы, што развіццё супольнасцяў не з’яўляецца нейтральным працэсам ані з гледзішча палітыкі, ані з гледзішча каштоўнасцяў. Мы зрабілі ясную публічную заяву пра нашы каштоўнасці, і гэтыя каштоўнасці ёсць галоўнымі ў азначэнні IACD 2016 г. і ляжаць у падмурку гэтага дакумента.



Рашэнне IACD апублікаваць сваю заяву, якая б вызначала і тлумачыла развіццё супольнасцяў, стала вынікам даследавання (даследаванне IACD адукацыйных праграм па развіцці супольнасцяў ва ўсім свеце, 2015 г.), якое паказала, што рознымі адукацыйнымі ўстановамі, працадаўцамі і спецыялістамі розных краін развіццё супольнасцяў сапраўды разумеецца вельмі шырока і свабодна. Мы вылучылі некалькі сотняў студэнцкіх праграм, дзе развіццё супольнасцяў было часткай курса. Некаторыя з тых, што мы выявілі, рыхтавалі спецыялістаў па развіцці супольнасцяў, іншыя звязвалі развіццё супольнасцяў з такімі дысцыплінамі як ахова здароўя, эканоміка, сацыяльная праца, развіццё сельскіх раёнаў ці міжнароднае развіццё (і гэта не ўсе прыклады!). Мы не даследавалі падрабязна змест гэтых курсаў і не ацэньвалі іх якасць, але сам факт таго, што яны існуюць і распаўсюджваюцца, дазваляючы студэнтам пачаць кар’еру ў галіне развіцця супольнасцяў, сведчыць, што практыка развіцця супольнасцяў існуе ў многіх развітых краінах і краінах у стадыі развіцця і што ёсць рынкавы попыт на такіх спецыялістаў.



4. Practice Insights 9. Special 65th Birthday Issue. January 2018.
5. http://www.iacdglobal.org/practice-exchange/mapping-study/



Такім чынам, IACD як міжнародная прафесійная асацыяцыя, упэўнена ў тым, што важна заахвочваць спецыялістаў (аплачвальных і неаплачвальных) прыняць агульнае разуменне мэты развіцця супольнасцяў, пабудаванай на агульных каштоўнасцях. Мы маем намер падтрымліваць высокія стандарты практыкі, грунтуючыся на ўзгоджаным калектыўным уяўленні, што гэта такое і наколькі “прафесійны” азначае “кампетэнтны”.

У той час, калі свет кідае ўсё больш выклікаў і, адначасова, павялічваецца колькасць новых працоўных месцаў і магчымасцяў практыкі ў галіне развіцця супольнасцяў, усё большае значэнне набываюць Мэты ўстойлівага развіцця ААН (МУР), іх нацыянальнае і рэгіянальнае ажыццяўленне. Для нашай прафесіі неабходна абдумаць цяперашняе становішча і ацаніць, наколькі існуючыя магчымасці прафесійнага навучання развіццю супольнасцяў адпавядаюць гэтым выклікам. Прыняцце Мэтаў устойлівага развіцця ААН у 2016 г. дае спецыялістам па развіцці супольнасцяў вялікую магчымасць паказаць, як можна дапамагчы супольнасцям пабудаваць свой патэнцыял, беручы ўдзел у рэалізацыі МУР, і наколькі гэта павысіць здольнасць супольнасцяў вырашаць праблемы змены клімату, прапаганды здаровага ладу жыцця, змяншэння маштабаў беднасці і неперарыўнай адукацыі.



# АБАПІРАЮЧЫСЯ НА НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ СТАНДАРТЫ

Цягам апошніх гадоў некаторыя нацыянальныя асацыяцыі і агенцтвы развіцця супольнасцяў стварылі тое, што звычайна называюць нацыянальнымі ці прафесійнымі стандартамі развіцця супольнасцяў. Яны апісваюць, што чалавеку неабходна рабіць, ведаць і разумець, каб займацца практыкай развіцця супольнасцяў на высокім узроўні, і дапамагаюць у прафесійным развіцці працоўнай сілы, спрыяючы добрай практыцы, якая аб’ядноўвае навыкі, веды і каштоўнасці як аснову працы. У некаторых краінах гэтыя нацыянальныя стандарты нясуць функцыю калегіяльнага кантролю, які ўлічвае інтарэсы спецыяліста, кіраўніцтва, “карыстальніка” і адукацыйнай арганізацыі з іх досведам пралікаў у практыцы. Мэтай ёсць развіццё шэрагу ўзгодненых стандартаў, якія б адлюстроўвалі агульнае разуменне намераў, працэсаў і ключавых роляў развіцця супольнасцяў, якія змогуць забяспечыць падтрымку ўсім практыкам.

Хоць большасць існуючых стандартаў заснаваныя на практыцы і ведах (і меркаваннях) грамадства Паўночнага паўшар’я, факт, што стварылі іх розныя нацыянальныя аб’яднанні і агенцтвы па развіцці супольнасцяў у некалькіх краінах, з’яўляецца надзвычай важнай адпраўной кропкай. Мы ўпэўнены, што гэтыя падыходы могуць быць адаптаваныя ва ўсім свеце, і гэта ўжо пачынае здзяйсняцца, напрыклад, праз рух у гэтым накірунку ў Паўднёвай Афрыцы і Новай Зеландыі.

За апошнія тры дзесяцігоддзі спецыялісты, выкладчыкі і працадаўцы вялі велізарную працу, каб дапасаваць кампетэнцыі, якія патрабуюцца для практыкі, з неабходнымі спецыялістам ведамі, уменнямі і каштоўнасцямі, а таксама навучаннем.





Гэтыя нацыянальныя стандарты ёсць адпраўной кропкай, з якой павінен пачацца працэс выклікаў, змен і ўзбагачэння (прыклады стандартаў можна знайсці ніжэй). На тое, што мы называем "Агульнымі міжнароднымі стандартамі практыкі развіцця супольнасцяў" у значнай меры паўплывалі работы, якія апошнімі гадамі з'явіліся ў Ірландыі, Злучаным Каралеўстве, Паўднёвай Афрыцы і Новай Зеландыі.

## ПРАКТЫКА ПА РАЗВІЦЦІ СУПОЛЬНАСЦЯЎ – ГЭТА БОЛЬШ, ЧЫМ ГРАМАДСКАЯ ПРАЦА

У наступным раздзеле "Тэмы, ключавыя накірункі і сцверджанні практыкі" мы апісваем, як IACD бачыць практыку развіцця супольнасцяў. Гэта практыка ажыццяўляецца людзьмі, якія выступаюць у розных ролях і кантэкстах, уключна непасрэдна са спецыялістамі па працы ў супольнасцях і людзьмі, якія выконваюць тыя ж абавязкі, але называюцца па-іншаму, а таксама прафесіяналамі ў іншых галінах – ад сацыяльнай працы, адукацыі дарослых, працы з моладдзю, медычных дысцыплін, экалагічнай адукацыі, мясцовага эканамічнага развіцця да гарадскога планавання, адраджэння, архітэктуры і г.д., *якія імкнуцца прымяняць каштоўнасці і скарыстаць метады развіцця супольнасцяў.*

**Мы прапануем спасылацца на іх як на "спецыялістаў па развіцці супольнасцяў",** і ўжываць гэту фармулёўку як усёабдымны тэрмін, які ўключае таксама "работнікаў супольнасцяў". **Мы выкарыстоўваем тэрмін "спецыяліст па развіцці супольнасцяў", каб ён абазначаў і людзей, занятых (на платнай ці бясплатнай аснове) у дадзенай галіне прафесійнай дзейнасці, і іншых прафесіяналаў у сумежных сектарах, якія ў сваёй працы карыстаюцца каштоўнасцямі і метадамі развіцця супольнасцяў.**

Практыка развіцця супольнасцяў таксама ахоплівае шэраг прафесійных установак і ўзроўняў пасад, пачынаючы ад тых, хто працуе з супольнасцямі, сканчваючы пасадамі, на якіх ажыццяўляюцца функцыі кіравання і стратэгічнага планавання.





6. http://cldstandardscouncil.org.uk/
http://www.ohcc-ccso.ca/en/courses/community-development-for-health-promoters/module-one-concepts-values-and-principles/values-
http://ctb.ku.edu/en/table-of-contents/analyze/choose-and-adapt-community-interventions/ethical-issues/main
cdctn.org/photos/custom/3.%20Code%20of%20Ethics.pdf
http://www.iedconline.org/web-pages/inside-iedc/iedc-code-of-ethics/
http://www.comm-dev.org/about/principles-of-good-practice
http://cldstandardscouncil.org.uk/resources/national-occupational-standards/






Усе спецыялісты граюць жыццёва важную ролю ў прасоўванні дэмакратыі ўдзелу, устойлівага развіцця, правоў, эканамічных магчымасцяў, роўнасці і сацыяльнай справядлівасці праз арганізацыю, адукацыю і пашырэнне правоў і магчымасцяў людзей у супольнасцях. Мы спадзяемся, што гэтыя Стандарты будуць карыснымі для ўсіх.

## Зірнем падрабязней на азначэнне IACD

> ***"Развіццё супольнасцяў – гэта практыка-арыентаваная прафесія і акадэмічная дысцыпліна, якая прасоўвае дэмакратыю, устойлівае развіццё, правы, эканамічныя магчымасці, роўнасць і сацыяльную справядлівасць праз арганізацыю, адукацыю і пашырэнне правоў і магчымасцяў людзей у межах іх супольнасцяў, сфармаваных па месцазнаходжанні, ідэнтычнасці ці зацікаўленасці, у гарадскіх ці сельскіх раёнах".***

Гэтае азначэнне можна разглядаць як увасабленне асноўных каштоўнасцяў, мэт і метадаў працы.

## A. Асноўныя каштоўнасці

Гэтае азначэнне мае як яўныя, так і прыхаваныя сцверджанні пра каштоўнасці і ідэалы, якія павінны стаяць у падмурку практыкі. Яны могуць быць выражаныя:

***прыхільнасцю да правоў, салідарнасцю, дэмакратыяй, роўнасцю, экалагічнай і сацыяльнай справядлівасцю.***

Гэтая заява пазіцыянуе прафесійную практыку як працу згодна з этычнымі стандартамі ў розных кантэкстах, працу з людзьмі і арганізацыямі па выкананні розных задач.



### B. Мэта

У азначэнні выражана мэта развіцця супольнасцяў:

***Праца з супольнасцямі дзеля дасягнення дэмакратыі ўдзелу, устойлівага развіцця, правоў, эканамічных магчымасцяў, роўнасці і сацыяльнай справядлівасці.***

Такі высокі ўзровень можа быць эталонам для ацэнкі і працэсу, і выніку.



## C. Асноўныя метады і працэсы

У азначэнні ёсць ясна акрэсленыя метады і працэсы, прынятыя практыкамі развіцця супольнасцяў:

*“арганізацыя, адукацыя і пашырэнне правоў і магчымасцяў людзей у межах іх супольнасцяў...”*

Мы вылучылі такія метады развіцця супольнасцяў, як арганізацыя і адукацыя, таму што яны засяроджаны на пашырэнні ўдзельнікамі сваіх магчымасцяў і на спалучэнні дзеяння і навучання. Гэты працэс заснаваны на дыялогу паміж удзельнікамі і спецыялістам па развіцці супольнасцяў, у ягонай ролі арганізатара ці настаўніка; на развіцці ўзаемнай павагі, даверу і навучання. Тут мы прызнаем існаванне канфліктаў у практыцы развіцця супольнасцяў, важнасць пераадольваць няўпэўненасць і супярэчлівасці, якія ствараюць пагрозу бягучаму становішчу, і прымянення “кампетэнтнай салідарнасці”, як яе назваў адзін з нашых рэспандэнтаў.




## Але хто ўдзельнікі?

## D. Удзельнікі

Азначэнне IACD спасылаецца на **людзей у супольнасцях, сфармаваных па месцазнаходжанні, ідэнтычнасці ці інтарэсах.** Можна зрабіць выснову, што перш за ўсё практык працуе з групамі людзей у межах супольнасці, і ў гэтым, відавочна, сутнасць развіцця супольнасцяў. Але супольнасць не існуе ў ізаляцыі, яна ўвесь час узаемадзейнічае з шэрагам урадавых устаноў, неўрадавых арганізацый, камерцыйнымі кампаніямі, пастаўцамі паслуг, кіраўнікамі, палітыкамі і наогул са свецкім грамадствам.



Гэта падкрэслівае двухбаковую накіраванасць працы практыкаў развіцця супольнасцяў: і з людзьмі ў іх супольнасцях, і з шэрагам агенцтваў і арганізацый за межамі гэтых супольнасцяў: з урадам, мясцовымі ўладамі, няўрадавымі арганізацыямі, прыватным сектарам, міжнароднымі фундатарамі і г.д. Такім чынам, арганізацыйная і адукацыйная праца, якую вядзе практык, таксама ўплывае на знешнія агенцтвы, каб яны давалі шырэйшыя правы і магчымасці супольнасцям.



**Мы вызначылі восем тэм, агульных для практыкі развіцця супольнасцяў. Імі з'яўляюцца:**

- Укараненне каштоўнасцяў у практыку
- Узаемадзеянне з супольнасцямі
- Забеспячэнне сумеснага планавання
- Арганізацыя для зменаў
- Навучанне для зменаў
- Прасоўванне разнастайнасці і інклюзіі
- Развіццё лідарства і інфраструктуры
- Развіццё і паляпшэнне палітыкі і практыкі





*Малюнак 1. Тэмы, агульныя для практыкі развіцця супольнасцяў ва ўсім свеце.*




*Гэты малюнак мае ілюстрацыйны характар і не азначае штучнага лінейнага працэсу, дзе адно ідзе за другім. У рэальнасці паміж кожнай з гэтых тэм ідзе працяглы цыкл зваротнай сувязі, паколькі практык развіцця супольнасцяў працуе з людзьмі ў супольнасці і з многімі агенцтвамі і арганізацыямі, якія ўплываюць на гэтыя супольнасці.*





**Затым мы вызначылі ключавыя накірункі, звязаныя з кожнай з гэтых тэм, таму што практыка развіцця супольнасцяў ажыццяўляецца людзьмі, незалежна ад іх прафесіі. Зыходзячы з гэтага, мы распрацавалі стандарты па кожным з ключавых напрамкаў, якія паказваюць, што з сябе павінна ўяўляць практыка.**

Гэтая інфармацыя выкладзена ў наступных раздзелах.

Як мы ўжо адзначылі, прафесійная практыка развіцця супольнасцяў ахоплівае шэраг прафесійных установак. У межах вызначаных роляў, спецыялісты больш засяроджаныя на некаторых тэмах і працоўных накірунках, чым іншыя, і могуць не мець магчымасці ці патрэбы працаваць згодна з усімі стандартамі. Усе практыкі развіцця супольнасцяў павінны, тым не менш, азнаёміцца з усімі тэмамі, працоўнымі накірункамі і стандартамі, каб ведаць, як іх практыка звязаная з працэсам зменаў і ўплывае на яго.

Стратэгіі і тактыкі, якія супольнасці выбіраюць (і якія з найбольшай верагоднасцю дапамогуць ім змяніцца да лепшага) вельмі разнастайныя, у сувязі з розным палітычным, эканамічным, экалагічным, сацыяльным і культурным кантэкстам. Роля практыкаў развіцця супольнасцяў у адносінах да гэтага выбару ў тым, каб дапамагчы супольнасцям развіць сваё разуменне гэтых кантэкстаў і іх значэння, а таксама сумесна прымаць рашэнні, якія тычацца іх мэтаў і спосабаў іх дасягнуць. Але якія прыняць стратэгіі і тактыкі, за супольнасці вырашаюць практыкі, карыстаючыся сваім адукацыйным і арганізацыйным досведам, каб падзяліцца новымі ідэямі і магчымасцямі з людзьмі, з якімі яны працуюць.







Тэмы, ключавыя накірункі і сцверджанні з'яўляюцца рэкамендацыямі для практыкі развіцця супольнасцяў. Яны не даюць перавагу якому-небудзь тыпу стратэгіі ці тактыкі над другім.

# ТАБЛІЦА 1:
## Тэмы і ключавыя накірункі

| ТЭМЫ | КЛЮЧАВЫЯ НАКІРУНКІ ПРАКТЫКІ |
|---|---|
| **Каштоўнасці ў практыку** | Разумець каштоўнасці, працэсы і вынікі развіцця супольнасцяў, і прымяняць іх на практыцы ва ўсіх іншых ключавых накірунках. |
| **Узаемадзеянне з супольнасцямі** | Разумець і ўзаемадзейнічаць з супольнасцямі, будуючы і падтрымліваючы адносіны з асобамі і групамі. |
| **Супольнае планаванне** | Развіваць і падтрымліваць супольную працу і ўдзел супольнасці. |
| **Арганізацыя дзеля зменаў** | Даваць супольнасцям магчымасць дзейнічаць разам, павялічваць іх уплыў і, калі неабходна, даваць ім доступ да рэсурсаў і сэрвісаў, развіваць іх уменне кіраваць імі і кантраляваць іх. |
| **Навучанне дзеля зменаў** | Падштурхоўваць людзей і арганізацыі вучыцца разам і паляпшаць разуменне, упэўненасць і ўменні, патрэбныя для сацыяльных зменаў. |
| **Разнастайнасць і інклюзія** | Распрацоўваць і ўкараняць практыкі, палітыку, структуры і праграмы, якія прызнаюць і паважаюць разнастайнасць і прасоўваюць інклюзію. |
| **Лідарства і інфраструктура** | Садзейнічаць і падтрымліваць развіццё арганізацый і інфраструктуры для развіцця супольнасцяў, ухваляць лідарства, якое пашырае правы і магчымасці людзей. |
| **Развіваць і ўдасканальваць практыку і палітыку** | Развіваць, ацэньвац і ўплываць на практыку і палітыку развіцця супольнасцяў, выкарыстаўваючы супольны аналіз, каб карэктаваць і ўдасканальваць стратэгічную і эксплуатацыйную практыку. |



# Тэмы, ключавыя накірункі і сцверджанні пра практыку

## ТЭМА 1:

## Каштоўнасці ў практыку



Гэтая тэма сфакусавана на разуменні каштоўнасцяў, якія стаяць у падмурку практыкі развіцця супольнасцяў ва ўсіх кантэкстах, працэсаў, на якіх яна заснавана, і вынікаў, да якіх яна прыводзіць, а таксама прымяненне гэтага разумення непасрэдна ў кантэксце спецыяліста.

### Практыка развіцця супольнасцяў
### КЛЮЧАВЫ НАКІРУНАК 1:

***Разумець каштоўнасці, працэсы і вынікі развіцця супольнасцяў, і прымяняць іх на практыцы ва ўсіх іншых ключавых накірунках.***

Спецыялістам па развіцці супольнасцяў, якія працуюць па шэрагу дысцыплін, неабходна:

a. Разумець каштоўнасці, працэсы і вынікі развіцця супольнасцяў у межах уласнага кантэксту і ролі.

b. Ведаць, якім чынам развівацца ў якасці практыка па развіцці супольнасцяў.

c. Ведаць, як падтрымліваць і прасоўваць развіццё супольнасцяў у межах сваёй і іншых арганізацый.



# ТЭМА 2:
## Узаемадзеянне з супольнасцямі





Гэтая тэма сфакусавана на знаёмстве з супольнасцямі, з якімі спецыяліст працуе, разуменні праблем, якія ўплываюць на іх, і развіцці стасункаў, якія забяспечваюць базу для працы на пазітыўныя змены.

### Практыка развіцця супольнасцяў
### КЛЮЧАВЫ НАКІРУНАК 2:

*Разумець і ўзаемадзейнічаць з супольнасцямі, будуючы і падтрымліваючы адносіны з асобамі і групамі.*

Спецыялісту па развіцці супольнасцяў неабходна:

a. Разумець сацыяльныя, палітычныя, эканамічныя, культурныя і экалагічныя фактары, якія маюць уплыў на мясцовыя супольнасці, асабліва на маргінальныя групы.

b. Разумець, як вывучаць супольнасць, вызначаць актыў, патрэбы, нефармальныя сувязі, цікавасці, матывацыі, дынаміку кіравання, перашкоды да ўдзелу, магчымасці, і як выкарыстоўваць свае даследчыя навыкі ў гэтым працэсе.

c. Ведаць, як узаемадзейнічаць са ўсімі групамі супольнасці, слухаць і эфектыўна камунікаваць асабіста і праз даступныя сродкі абмену інфармацыяй.

d. Разумець, паважаць і прызнаваць працу, каштоўнасці, магчымасці і мэты груп, уключаць усе слаі супольнасці і будаваць стасункі, заснаваныя на ўзаемным даверы.

e. Ведаць, як працаваць з супольнасцямі, вызначаць магчымасці, развіваць удзел і інклюзію, і як пераадольваць перашкоды.

f. Ведаць, як працаваць з супольнасцямі дзеля агульнай згоды, высвятляючы канфлікты інтарэсаў і выкарыстоўваючы эфектыўныя спосабы іх вырашыць.

# ТЭМА 3:
## Агульнае планаванне

Гэтая тэма сфакусавана на развіцці супольнага ўдзелу, пашырэнні магчымасцяў партнёрства і падтрымцы супольнасцяў і агенцтваў у развіцці навыкаў умацавання сумеснай працы.

### Практыка развіцця супольнасцяў
### КЛЮЧАВЫ НАКІРУНАК 3:

***Разумець, развіваць і падтрымліваць супольную працу і ўдзел супольнасці.***

Спецыялісту па развіцці супольнасцяў неабходна:

a. Садзейнічаць разуменню супольнасцямі мясцовых, нацыянальных і глабальных палітычных працэсаў, крыніц ўлады і ўплыву.

b. Дапамагаць супольнасцям разумець і выкарыстоўваць як існуючую інфармацыю, так і прымяненне даследчыцкіх метадаў у сваім асяроддзі.

c. Ініцыяваць і ўдзельнічаць у партнёрстве і сумеснай працы дзеля пашырэння правоў і магчымасцяў супольнасцяў, распазнаючы і рэгулюючы канфлікты інтарэсаў.

d. Садзейнічаць стасункам паміж супольнасцямі, дзяржаўнымі органамі, няўрадавымі арганізацыямі і іншымі агенцтвамі дзеля пашырэння правоў і магчымасцяў супольнасцяў і рэалізацыі іх інтарэсаў.

e. Уплываць на дзяржаўныя органы і іншыя арганізацыі, якія прымаюць рашэнні, каб пабудаваць эфектыўныя стасункі з супольнасцямі.

f. Працаваць з супольнасцямі і агенцтвамі, каб высветліць патрэбы, магчымасці, правы і абавязкі, даведацца пра канфлікты інтарэсаў і вырашыць іх.

g. Разбурыць перашкоды да агульнага ўдзелу і дапамагчы прадстаўнікам супольнасці браць на сябе актыўныя ролі ў стратэгічным планаванні, прыняцці рашэнняў і дзеянні.



# ТЭМА 4:
## Арганізацыя дзеля зменаў

Гэтая тэма сфакусавана на стварэнні ўмоваў для супольнасцяў, каб дзейнічаць разам і развіваць патрэбныя для гэтага ўменні, развіваць кантэкст, дзе калектыўная дзейнасць устойлівая і падтрымліваецца як сіла, што вядзе да лепшых змен.

### Практыка развіцця супольнасцяў КЛЮЧАВЫ НАКІРУНАК 4:

*Даваць супольнасцям магчымасць дзейнічаць разам, павялічваць іх уплыў і, калі неабходна, даваць ім доступ да рэсурсаў і сэрвісаў, развіваць іх уменне кіраваць імі і кантраляваць іх.*



Спецыялісту па развіцці супольнасцяў неабходна:

a. Ствараць для людзей умовы для сумеснай працы, вызначаць, чаго яны хочуць дасягнуць, і развіваць групы і віды дзейнасці.

b. Падтрымліваць супольнасці на шляху да добрых зменаў.

c. Падтрымліваць людзей у эфектыўным кіраванні і вырашэнні канфліктаў у межах адной і паміж некалькімі супольнасцямі ці групамі.

d. Уплываць на асоб, якія прымаюць рашэнні, каб яны прынялі патэнцыйныя выгады калектыўнай дзейнасці супольнасцяў, і пабудаваць з імі стасункі.

e. Падтрымліваць супольнасці ў супольным складанні бюджэту, у кіраванні і ўладанні зямлёй, рэсурсамі і паслугамі.

f. Падтрымліваць доступ супольнасцяў да рэсурсаў, фінансавання і тэхнічнай дапамогі на рэалізацыю іх дзейнасці.

# ТЭМА 5:
## Навучанне дзеля змен

Гэтая тэма сфакусавана на паляпшэнні ўмоў навучання людзей у супольнасцях і практыкаў, якія з імі працуюць, дзеля зменаў і развіцця.

## Практыка развіцця супольнасцяў
## КЛЮЧАВЫ НАКІРУНАК 5:

***Падтрымліваць людзей і арганізацыі ў супольным навучанні дзеля сацыяльных зменаў.***

Спецыялісту па развіцці супольнасцяў неабходна:

a. Выкарыстаўваць вопыт, веды і ўменні людзей як адпраўную кропку для сумеснай дзейнасці, і метады для вызначэння і задавальнення навучальных патрэбаў удзельнікаў і практыкаў.

b. Развіваць магчымасці навучання і формы дзейнасці, каб задаволіць выказаныя патрэбы развіцця супольнасцяў у дыялогу з асобнымі ўдзельнікамі і групамі.

c. Выкарыстоўваць эфектыўныя навыкі камунікацыі, такія як актыўнае/эмпатычнае слуханне, пісьмовая і візуальная камунікацыя, сацыяльныя медыі, фільмы і друкаваныя медыі, сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі, каб падтрымаць калектыўнае навучанне і супольную дзейнасць.

d. Прасоўваць змены, якія адлюстроўваюць каштоўнасці і мэты развіцця супольнасці праз супольнае навучанне.

e. Падтрымліваць партнёрскія стасункі з урадавымі, няўрадавымі і прыватнымі арганізацыямі, каб вызначыць навучальныя патрэбы іх супрацоўнікаў у дачыненні да развіцця супольнасці.



# ТЭМА 6:
# Разнастайнасць і інклюзія

Гэтая тэма сфакусавана на прызнанні разнастайнасці і падтрымцы інклюзіі як галоўных аспектаў практыкі.

## Практыка развіцця супольнасцяў
## КЛЮЧАВЫ НАКІРУНАК 6:

***Распрацоўваць і укараняць практыкі, палітыку, структуры і праграмы, якія прызнаюць і паважаюць разнастайнасць і прасоўваюць інклюзію.***



Практыкам развіцця супольнасцяў неабходна:

a. Разумець, як сацыяльныя, палітычныя, эканамічныя, культурныя і экалагічныя фактары ўплываюць на розныя часткі супольнасці, у прыватнасці, на маргінальныя групы.

b. Выкарыстоўваць інклюзіўны падыход у адносінах да розных, у тым ліку маргінальных, супольнасцяў, праз метады ўзаемадзеяння забяспечваць інклюзіўнасць і павагу да разнастайнасці.

c. Ведаць, як дапамагчы групам развіць свае навыкі і ўпэўненасць для далучэння маргінальных супольнасцяў.

d. Ведаць, як змагацца з дыскрымінацыяй з боку агенцтваў, якія працуюць у супольнасцях, і груп супольнасцяў; падтрымліваць выключаных з супольнасці, маргінальных ці дыскрымінаваных людзей, каб яны поўна і актыўна маглі ўдзельнічаць у дзейнасці і групах супольнасці.

e. Ведаць, як паказаць культурную гуманнасць, ствараючы прастору, бяспечную для людзей з розным светапоглядам, карыстаючыся мясцовымі традыцыямі і звычаямі, якія дазваляюць ім поўнасцю ўдзельнічаць у жыцці грамадства.

f. Ведаць, як падтрымаць агенцтвы і супольнасці ў прыняцці інклюзіўных практык і павазе да разнастайнасці.

g. Ведаць, як распрацоўваць і падтрымліваць інклюзіўную палітыку, праграмы і практыкі.

# ТЭМА 7: Лідарства і інфраструктура

Гэтая тэма сфакусавана на пашырэнні правоў і магчымасцяў лідарства ў супольнасцях і стварэнні інфраструктуры для развіцця супольнасцяў і ўстойлівага сацыяльнага абнаўлення.

## Практыка развіцця супольнасцяў КЛЮЧАВЫ НАКІРУНАК 7:

***Садзейнічаць і падтрымліваць развіццё арганізацый і інфраструктуры для развіцця супольнасцяў, ухваляць лідарства, якое пашырае правы і магчымасці людзей.***

Спецыялістам па развіцці супольнасцяў неабходна:

a. Падтрымліваць групы ў разглядзе сваёй уласнай палітыкі і практык, знешніх магчымасцяў і пагроз.

b. Падтрымліваць групы ў планаванні сваёй будучыні, распрацоўцы стратэгічных і бізнэс-планаў дзеля дасягнення іх мэт і задач.

c. Падтрымліваць развіццё магчымасцяў адказнага і дэмакратычнага лідарства ў супольнасцях.

d. Ведаць, як уплываць на ўласныя і партнёрскія арганізацыі; кансультаваць іх наконт арганізацыйных структур, палітыкі, практык і паводзін дзеля развіцця супольнасцяў.

e. Разумець палітычны кантэкст і магчымасці, праблемы і рызыку, якія паўстаюць з яго; падтрымліваць супольнасці і партнёраў у распрацоўцы стратэгій у гэтым кантэксце.

f. Выхоўваць лідарства ў мясцовых супольнасцях і ўхваляць прыняцце дэмакратычнага і інклюзіўнага стыляў лідарства ў працы з супольнасцямі і партнёрамі, зацікаўленымі ва ўдзеле супольнасцяў.

g. Падтрымліваць і ўплываць на арганізацыі ў распрацоўцы працоўных сістэм, якія эфектыўна прасоўваюць практыку развіцця супольнасцяў.





# ТЭМА 8:
# Развіццё і ўдасканаленне палітыкі і практыкі



Гэтая тэма сфакусавана на выкарыстанні водгукаў пры супольным ацэньванні і аналізе суадносных знешніх фактараў для ўдакладнення і распрацоўкі палітыкі і практыкі.

## Практыка развіцця супольнасцяў
## КЛЮЧАВЫ НАКІРУНАК 8:

***Развіваць, ацэньвац і ўплываць на практыку і палітыку развіцця супольнасцяў, выкарыстоўваючы супольны аналіз, каб карэктаваць і ўдасканальваць стратэгічную і эксплуатацыйную практыку.***

Спецыялісту па развіцці супольнасцяў неабходна:

a. Вывучаць і ацэньваць формы дзейнасці і практыку развіцця супольнасцяў, выкарыстоўваючы метад зваротнай сувязі.

b. Падтрымліваць групы супольнасці ў выкарыстанні маніторынгу і ацэнкі для адлюстравання прагрэсу, у навучанні на аснове вопыту, у аналізе рэзультату і ў планаванні будучых дзеянняў.

c. Збіраць і выкарыстоўваць дадзеныя са сваёй практыкі і ад іншых супольнасцяў, з якімі яны працуюць, з мэтай інфармавання і ўплыву на развіццё палітыкі і практыкі.

d. Аналізаваць уплыў сацыяльных, палітычных, эканамічных, культурных і экалагічных змен на практыкі развіцця супольнасцяў ва ўласным кантэксце.

e. Падтрымліваць практыкаў і групы супольнасці ў выкарыстанні маніторынгу і ацэнкі дзейнасці па развіцці супольнасцяў, у разважанні над рэзультатамі, развіцці практыкі, дэманстрацыі дасягненняў.

f. Ацэньваць водгукі на дзейнасць па развіцці супольнасцяў і аналізаваць шырэйшы сацыяльны, палітычны, эканамічны і экалагічны кантэксты для карэкцыі палітыкі і практыкі развіцця.

g. Уключаць у працу працэс крытычнага аналізу з мэтай вызначыць і прымяніць веды, каб увесь час удасканальваць практыку.

h. Рыхтаваць аналітычныя справаздачы для агенцтваў, фундатараў і іншых зацікаўленых бакоў.

# ВЫСНОВЫ
# І
# НАСТУПНЫЯ КРОКІ

Праца над агульным зборам Міжнародных стандартаў заўсёды была лагічным наступным крокам у развіцці агульнага азначэння развіцця супольнасцяў. Паколькі яго прымаюць і выкарыстоўваюць усё больш, мы спадзяемся, што той жа лёс чакае і гэтыя Міжнародныя стандарты.

У пачатковых раздзелах гэтага дапаможніка мы пісалі, што мы бачым гэтыя Міжнародныя стандарты пачатковай кропкай для практыкаў развіцця супольнасцяў, якія працуюць у розных краінах, каб прымяняць і адаптавацца пад розныя працоўныя кантэксты – сацыяльна, эканамічна, культурна і палітычна. Мы прызнаём, што гэтыя кантэксты вельмі адрозніваюцца, таму Стандарты не з'яўляюцца прадпісальнымі. IACD не рэгулюе практыку, і для практыкаў ці арганізацый няма абавязкаў ці патрабаванняў прыняць гэтыя стандарты. Тым не менш, падчас распрацоўкі гэтых стандартаў, мы мелі намер прапанаваць іх як дапаможнік для практыкаў, адукацыйных арганізацый, працадаўцаў, рэгіянальных і нацыянальных асацыяцый развіцця супольнасцяў і нацыянальных урадаў, каб яго выкарыстоўвалі дзеля павышэння якасці практыкі развіцця супольнасцяў і якасці праграм і магчымасцяў для прафесійнага развіцця. Гэтыя агульныя міжнародныя стандарты таксама даюць магчымасць пашырэння міжнароднага ўзаемадзеяння і міжнароднага абмену ў навучанні і практыцы развіцця супольнасцяў.

Найбольш мы спадзяемся, што, як агульныя міжнародныя стандарты, яны падтрымаюць міжнароднае разуменне і ўзаемазвязанасць з практыкай сярод тых, хто займаецца развіццём супольнасцяў.

## Як можна карыстацца Міжнароднымі стандартамі?

Паколькі Стандарты можна выкарыстоўваць як дапаможнік для сумеснага вызначэння месца прызначэння (вынікаў) і формы падарожжа (працэсу), іх таксама можна выкарыстоўваць, каб крытычна разважаць і пра падарожжа, і пра мэту. Іншымі словамі, іх можна выкарыстоўваць, каб планаваць, выконваць і аналізаваць дзейнасць і вучыцца ў працэсе.

Як такія, іх могуць выкарыстоўваць усе практыкі развіцця супольнасцяў некалькімі спосабамі:

• пабудаваць агульнае ўсведамленне і разуменне, чым ёсць развіццё супольнасцяў,

• прасоўваць каштоўнасці, на якіх развіццё супольнасцяў заснавана,

• пашыраць практыку,

• фармуляваць тэорыю і палітыку,

• фармаваць акадэмічнае і практыка-арыентаванае навучанне.










Мы спадзяемся, што яны распаўсюдзяцца сярод практыкаў развіцця супольнасцяў і іх будуць выкарыстоўваць адпаведным чынам у краінах, дзе нацыянальныя стандарты і межы ўжо існуюць, і як інструкцыя ў тых краінах, дзе нацыянальныя стандарты яшчэ не распрацавалі.

**Часткай нашага апытання па чарнавіку стандартаў была просьба людзей назваць адмысловыя спосабы іх выкарыстання. Прадстаўляем дасланыя ідэі ніжэй:**

• Справакаваць дыскусію наконт мэт, каштоўнасцяў і ключавых накірункаў развіцця супольнасцяў у міжнародным і мясцовым кантэкстах, у межах адной ці паміж некалькімі супольнасцямі і паміж агенцтвамі і арганізацыямі.

• Развіць рэсурсы, якія дапамогуць паказаць, наколькі розныя кантэксты маюць уплыў на агульныя вобласці практыкі ў межах некалькіх краін/супольнасцяў.




• Падтрымаць міжнародныя сувязі і дзяліцца прыкладамі і вопытам з практыкі.

• Пабудаваць агульнае разуменне галоўнай мэты і каштоўнасцяў развіцця супольнасцяў у супольнасцях і арганізацыях.

• Падтрымліваць абмеркаванне супольнага планавання і ўладання, што будуе супольную дзейнасць і пашырэнне правоў і магчымасцяў.

• Інфармаваць пра распрацоўку падрыхтоўчай адукацыі і курсаў павышэння кваліфікацыі для практыкаў развіцця супольнасцяў.



• Распрацаваць інструменты самаацэнкі.

• Падтрымаць абмен досведам і прыкладамі, як стандарты выкарыстоўваюцца для развіцця практыкі ў кожнай з абласцей, міжнародны досвед па агульных тэмах.

• Развіваць міжнародныя рэсурсы для ўключэння ў адукацыйныя і навучальныя праграмы – вылучэнне спрэчных і вострых асаблівасцяў практыкі.

• Удакладніць архіўныя дадзеныя па адукацыі Міжнароднага абмену па развіцці супольнасцяў (GCDEX) IACD.

• Прадставіць “агульны падмурак”, на якім развіваць міжнародныя даследаванні, якія шукаюць аспекты практыкі развіцця супольнасцяў.



Каб падтрымаць агульнае развіццё, мы просім вас дзяліцца з намі, як вы выкарыстоўваеце гэтыя стандарты. Першым крокам для стварэння жывых “*Супольнасцяў практыкі*” IACD зробіць адкрыты форум па стандартах на сваім вэб-сайце і, праз GCDEX мы створым адмысловы раздзел, дзе ўдзельнікі змогуць дзяліцца спосабам выкарыстання стандартаў і любымі рэсурсамі, якія яны ствараюць у адносінах да іх. Мы хочам таксама падтрымаць стварэнне міжнароднага форума для адукацыйных устаноў па развіцці супольнасцяў.

У 1970-ыя і 80-ыя, IACD кіравала *Домам навучання развіццю супольнасцяў*. Ён даўно ўжо зачынены, і з вялікім распаўсюдам (у некаторых выпадках закрыццём) студэнцкіх і спецыяльных праграм па ўсім свеце, якія прапануюць атрымаць вызначаны ўзровень адукацыі і навучання па развіцці супольнасцяў, наша роля сябе вычарпала. Тым не менш, у бліжэйшыя гады Камітэт па навучанні і прафесійным развіцці IACD будзе працаваць з партнёрамі па распрацоўцы і акрэдытацыі курсаў, у тым ліку анлайн-праграм і працяглых модуляў прафесійнага развіцця, нацэленых на практыкаў развіцця супольнасцяў з розных краін, уключна з акрэдытаванымі элементамі для нашых адукацыйных кароткатэрміновых курсаў.

**Калі вы зацікаўлены ўдзельнічаць у гэтай працы і далучыцца да “Супольнасці практыкі” міжнародных стандартаў IACD, калі ласка, звяжыцеся са старшынёй Камітэта па навучанні і прафесійным развіцці IACD Джонам Стэнсфілдам: jstansfield@unitec.ac.nz**



*This report was prepared for IACD by Colin Ross, Anna Clarke, Charlie McConnell, Paul Lachapelle and John Stansfield. IACD wishes to acknowledge the considerable support received from the Community Learning and Development Standards Council Scotland.*

# IACD's Practice Insights magazine

sharing practice and research about community development from around the world.




























Попередні випуски доступні тут: www.iacdglobal.org/category/resources/magazine/



# Пра IACD

IACD – адзіная глабальная сетка для практыкаў развіцця супольнасцяў. Мы падтрымліваем агенцтвы і практыкаў у развіцці патэнцыялу супольнасцяў для дасягнення большай сацыяльнай і эканамічнай роўнасці, аховы навакольнага асяроддзя і дэмакратыі ў палітыцы.

## Што мы робім?

IACD злучае людзей. Мы садзейнічаем абмену вопытам і практыкай, як віртуальна, так і на асабістых сустрэчах. Мы працуем з партнёрамі для правядзення рэгіянальных, нацыянальных і міжнародных імпрэз, навучальных візітаў і канферэнцый. Мы дакументуем працу нашых удзельнікаў па ўсім свеце, збіраючы тэматычныя даследаванні, інструменты і матэрыялы па развіцці супольнасцяў і дзелячыся імі праз наш сайт, публікацыі і электронныя бюлетэні. Мы вядзем даследчыцкія праекты, выкарыстоўваючы міжнародны вопыт.

Мэта IACD – даць сваім удзельнікам быць пачутымі на міжнародным узроўні, падтрымліваючы прынцыпы і практыку развіцця супольнасцяў на міжнародных форумах і кансультацыях. IACD мае статус кансультанта ў ААН і яе агенцтвах.

## Публікацыя артыкулаў

Наш міжнародны часопіс Practice Insights выходзіць тры разы на год. Кожны з іх прысвечаны канкрэтнай тэме, якая мае дачыненне да развіцця супольнасцяў. Калі вы хочаце атрымаць дадатковую інфармацыю ці зрабіць свой унёсак у будучыя выданні, калі ласка, напішыце на адрас charlie.mcconnell@iacdglobal.org. Апроч таго, удзельнікі IACD могуць публікаваць навіны, даследаванні і іншыя матэрыялы на нашай старонцы ў Фэйсбуку і на нашым сайце.

## Як далучыцца

За падрабязнасцямі звяртайцеся на www.iacdglobal.org/join-us.

Перавагі для нашых удзельнікаў:

- Штодзённыя навіны на Фэйсбуку пра міжнароднае развіццё супольнасцяў;
- Дасяг да Global Community Development Exchange – банка дадзеных на сайце IACD;
- Магчымасць браць удзел у навучальных візітах па абмене практыкай;
- Зніжкі на ўдзел у канферэнцыях IACD;
- Зніжкі на падпіску на Community Development Journal;
- Магчымасць падзяліцца сваёй працай і вопытам з сусветнай аўдыторыяй праз наш вэб-сайт, старонку на Фэйсбуку і ў іншых публікацыях;
- Удзельнікі таксама могуць прапаноўваць сваю кандыдатуру на працу ў Савеце IACD.







International Association for Community Development, Baltic Chambers, Suite 305,
50 Wellington Street, Glasgow G2 6HJ, Scotland, UK

+44 141 248 1924

Website: www.iacdglobal.org/

Facebook: www.facebook.com/IACDglobal

http://cldstandardscouncil.org.uk

Пераклад на беларускую мову - МДФ "Сямейны інклюзіў-тэатр"

Website: https://www.theatre-i.by/

Facebook: https://www.facebook.com/mbfinclusivetheatre/

Местный благотворительный фонд

# семейный инклюзив-театр

Сямейны інклюзіў-тэатр – сацыяльна-культурны праект, які працуе ў Мінску з 2016 году. Тут займаюцца дзеці і падлеткі, у тым ліку і з аўтызмам. Гэтая ініцыятыва дапамагае ім развіць уменні, пашырыць кола сяброў, рэалізаваць таленты і стацца паспяховымі. Тэатр стварае і папулярызуе роўныя ўмовы і магчымасці для творчасці ўсіх дзяцей дзякуючы сваёй штодзённай працы над пастаноўкай спектакляў.

Сямейны інклюзіў-тэатр – гэта сучасны тэатр, які спалучае класічную і сучасную харэаграфію, пластыку, вакал, элементы драматычнага і камедыйнага жанраў.

Гэта прастора прыцягальная для ўсіх і даступная кожнаму дзіцяці, незалежна ад ягоных здольнасцяў, магчымасцяў і асаблівых патрабаванняў.

Канцэпцыя інклюзіўнасці цалкам базуе на прызнанні таго факту, што ўсе дзеці з'яўляюцца раўнапраўнымі і паўнавартаснымі членамі грамадства. Пры гэтым, кожнае дзіця захоўвае сваю індывідуальнасць. У кожнага ёсць свае здольнасці, магчымасці і патрабаванні.

**Наша мэта – стварыць роўныя ўмовы для творчасці дзяцей з асаблівасцямі і дапамагчы ім сацыялізавацца.**

**Наша місія – распаўсюджваць ідэю грамадства роўных магчымасцяў.**

Задача тэатру – пастаноўка прафесійных відовішчных спектакляў для ўсёй сям'і, у якіх на сцэне выступаюць акторы – у тым ліку і дзеці з аўтызмам. У тэатры створаная асаблівая прастора для дзяцей, у якой яны адкрываюць свае таленты, вучацца акторскаму майстэрству, пластыцы, харэаграфіі і вакалу. А самае галоўнае — яны вучацца зносінам.

У тэатры – болей чым за сотню актораў, траціна з іх – з аўтызмам. У кожным сезоне тэатр рыхтуе пастаноўку двух новых спектакляў, а таксама выступае ініцыятарам і арганізатарам міжнароднага форуму «Тэатр і аўтызм. Пытанні і адказы», які праходзіць штовосень ў Мінску.

Нашай камандзе ўдалося стварыць платформу, якая ня толькі рэалізуе творчы патэнцыял дзяцей з аўтызмам, але і цалкам мяняе адносіны беларусаў да самой праблемы аўтызму. Мы ўпэўненыя, што неўзабаве зможам жыць у грамадстве, дзе да людзей з асаблівасцямі ставяцца прыязна і з павагаю.

Местный благотворительный фонд «Семейный инклюзив-театр»
220030, г. Минск, ул. Я. Купалы, д. 21, пом. 321
info@theatre-i.by
+375 29 6 111 606